Газета для вас

Калі ў хаце пахароны,
Газ даюць — аж два балоны.
Трэба цешчы падказаць:
Самы час, каб паміраць.



ІВАЦЭВІЧЫ-БАРАНАВІЧЫ-БЯРОЗА-ПРУЖАНЫ

№ 8(219) 26 лютага — 3 сакавіка 2000 г. | ГРАМАДСКАЕ НЕЗАЛЕЖНАЕ ВЫДАННЕ, ВЫХОДЗІЦЬ СА СТУДЗЕНЯ 1997 г. | Цана — 50 руб.

Человек года в области экономики и финансов

БАРАНОВИЧИ. Брестская область ежегодно проводит конкурс под таким названием. Вдвойне приятно жителям Барановичей, что в минувшем году победителем признан заведующий финансовым отделом Барановичского горисполкома В. И. Дичковский. Мы рады за Виктора Ивановича и надеемся, что его не зря удостоили этого звания: хороший специалист в состоянии добиться и хорошего исполнения бюджета-2000.

Галина СТРОЦКАЯ.

ПАЧЫНАЮЦЦА СТРАЙКІ

БЯРОЗА. Ідучы шляхамі інтэграцыі з Расіяй, мы шмат у якіх сферах усё больш раўняемся на ўсходнюю суседку. Так, паступова на некаторых прамысловых прадпрыемствах і ў сельскай гаспадарцы павялічваюцца затрымкі з выплатай заробкаў. Для прыкладу, нядоўга радаваліся іх павелічэнню ў лістападзе тыя, хто працуе ў вытворча-гандлёвай фірме "Цеплапрыбор". Бо тыя лістападаўскія зарплаты не атрымалі і перад Новым годам. А некаторыя здолелі іх атрымаць (ужо па разліковых квітках) толькі ў лютым. Калі нехта асабіста звяртаўся да генеральнага дырэктара з просьбай атрымаць хоць нейкую частку заробленага, каб неяк звесці канцы з канцамі, то атрымліваў адмову ў даволі абражальнай форме. Толькі некалькі цэхаў (участкаў) атрымалі снежаньскія заробкі. Не вытрымаўшы, калектыў участка па выпуску масланапоўненых электрарадыятараў амаль у поўным складзе правёў 22 лютага стыхійны аднадзённы страйк. Ужо да канца дня пяці працаўнікам заробак здолелі выплаціць.

Сяржук РУСЕЦКІ.

Вопыт каштоўны паўтарэннем

ПРУЖАНЫ. Праблемы павышэння ўрадлівасці глебы абмеркаваны на абласным семінары аграрыяў, які тут адбыўся. Наведаўшы тутэйшыя абласную праектна-вышуковую станцыю хімізацыі, абласную сельскагаспадарчую доследную станцыю і эксперыментальную базу "Белавусаўшчына", удзельнікі семінара даведаліся, як пры цяперашніх мізэрных магчымасцях тут атрымліваюць някепскія ўраджаі сельскагаспадарчых культур.

У семінары бралі ўдзел губернатар вобласці У. А. Заламай, спецыялісты вядучых навукова-даследчых інстытутаў, што працуюць на сельскую гаспадарку, а таксама чыноўнікі дзяржаўных структур.

Аляксандр ЛАЎРАНЮК.

"Блудэнскі кур'ер"

БЯРОЗА. У лютым пабачыў свет першы нумар вясковай газеты "Блудэнскі кур'ер" (Блудзнь — назва вёскі, якую за савецкім часам перайменавалі ў Першамайскую. Гэта — чыгуначная станцыя Бяроза-Картузская). Газета выйшла на 2-х аркушах фармату А-3 на добрай паперы з каляровым загалоўкам. Аўтары вынеслі на разгляд аднавяскоўцаў і ўладаў свае праблемы: тэрыторыю вёскі апанавалі розныя звалкі смецця, не працуе лазня, зачыніўся дзіцячы садок, існуюць цяжкасці з набыццём торфу. Распавялі таксама аб апошніх падзеях. Знайшлося месца і для вершаў школьніцы, і для нявыдуманых здарэнняў і прыгодаў, і для тэлефоннага даведніка Блудня, і для аб'яваў. Выпуск газеты, якая выйшла накладам 295 асобнікаў, падштурхнуў сельскія і раённыя ўлады да вырашэння праблем Блудня (колькасць жыхароў вёскі набліжаецца да 2 тысяч), узнятых у першым нумары. Рыхтуецца другі нумар.

Сяржук РУСЕЦКІ.



Дожить бы до весны... *Фото IREX/ProMedia.*

КОРОВКИ-ПУТЕШЕСТВЕННИЦЫ

БЕРЕЗА. 450 голов крупного рогатого скота прибыло в Березовский район, спасаясь от бескормицы в своем Верхнедвинском районе Витебской области. Животноводы там оказались в тяжелом положении: нет кормов, нет горючего, сохранение поголовья — под большим вопросом. И это — несмотря на субсидии государства.

Голодных коровок-путешественниц приютят и будут кормить березовские хозяйства "Борки", "Песковский", "Березовский" и другие, где пока ещё есть корма.

Василь СТРОК.

А ЦІ ЁСЦЬ ПАТЭНЦЫЯЛ?

ІВАЦЭВІЧЫ. У калектыўных гаспадарках раёна праходзяць справаздачна-выбарныя сходы. Як правіла, па тых жа сцэнарыях, што пяць-дзесяць гадоў таму: справаздача, планы на будучае і заахвочванне лепшых працаўнікоў.

Чым могуць пахваліцца аграрнікі? Па праўдзе сказаць, амаль нічым. Ураджайнасць усіх сельгаскультур рэзка знізілася. Спецыялісты тлумачаць гэта дрэнным надвор'ем. Надоі малака і прыбаўленні ў вазе буйной рагатай жывёлы штогод катастрафічна змяншаюцца. Ёсць калгасы ("40 год Кастрычніка", "Іскра", "Савецкая Беларусь"), дзе не надойваюць за год ад каровы па паўтары тысячы кілаграмаў малака. Добрая каза, думаецца, і то больш дасць.

Дый адкуль быць жывёлагадоўчай прадукцыі, калі ў многіх гаспадарках ужо саломы добрай няма для кармлення кароў і кормнікаў.

Напрыклад, у калгасе "Зара", як дасягненне, называлася лічба 3,5 працэнта. Такая рэнтабельнасць гаспадаркі за мінулы год.

У калгасе імя Кірава, які лічыцца ў параўнанні з іншымі эканамічна моцнай гаспадаркай, летась сярэдняя зарплата склала 12 мільёнаў рублёў. Таксама пра яе гаворыцца з гонарам. Але сваіх механізатараў пастаянна не хапае. Вось такая моцная гаспадарка.

У калгасе "Бусяжскі" на сходзе больш успаміналі мінулае, калі цяжкія вёдры з вадой насілі на ферму, чым гаварылі пра сённяшнія справы, і заклікалі маладых не баяцца цяжкасцей.

Пра патэнцыял калгасаў ужо некалькі гадоў гавораць нямала. А між тым калектыўныя гаспадаркі бяднеюць і развальваюцца. Сумна.

Міхаіл ДЗМІТРУК.

Не адступае грып

ІВАЦЭВІЧЫ. Хоць на Беларусі сітуацыя з грыпам нармалізавалася, па Івацэвічах і раёну яна паранейшаму застаецца складанай.

Так званы парогавы ўзровень штодня перавышаецца ў 4 і болей разоў. Так, 21 лютага было зарэгістравана 32 хворыя на грып, 22 лютага — 52.

Сёлетняя сітуацыя, па словах галоўнага дзяржаўнага санітарнага ўрача Івацэвіцкага раёна А. А. Ковыша, істотна адрозніваецца ад мінулагодняй. Тады эпідэмія была больш масавай, але кароткачасовай. У сёлетнім годзе сітуацыя застаецца складанай ужо каля месяца.

Што тычыцца становішча ў гарадскіх школах, то на 23 лютага ў СШ № 3 хварэла 14 % вучняў, СШ № 4 — 10, ліцэі — 7, СШ № 1 — 6,4, ПТВ — 6,6. Школьныя ўстановы зачыняюцца тады, калі хварэе 30% вучняў.

Аляксандр ГОРБАЧ.

Каждому преступнику — по автомобилю

БАРАНОВИЧИ. Криминальный мир города решил, видимо, что каждому преступнику нужны личные "колеса". Это шутка, конечно, а если серьёзно, то в пору самым серьезным образом обеспокоиться всем миром — и владельцам машин, и милиции. С 7 по 14 февраля угнаны три автомобиля — "Джетта", "Сиерра" и "Пассат". Причем, первые две машины стояли в гаражах и только "Пассат" угнали с улицы, но его и нашли. Угонщиками оказались подростки.

Четвертую машину — "Форд" тоже, явно, хотели угнать, да не вышло. Зато разукомплектовали так, что на восстановление потребуется не один миллион рублей.

Галина СТРОЦКАЯ.

Пасмяёмся разам з...

студэнтам IV курса Баранавіцкага каледжа лёгкай прамысловасці Алесем Пікулай:



Сустракаюцца дзве сяброўкі.

— Ведаеш, у мяне такі цудоўны муж! Не муж, а анёл.

— Мой, ведаеш, таксама не мужчына.

ПАДПІСКА—2000

У ВАС АФОРМЛЕНА ПАДПІСКА НА "ГАЗЕТУ ДЛЯ ВАС" ТОЛЬКІ НА ПЕРШЫ КВАРТАЛ?

Час бяжыць хутка. На двары — люты, а работнікі сувязі ўжо вядуць падпіску на другі квартал. Паспяшайцеся на пошту і аформіце падпіску на "Газету для вас". Зрабіць гэта можна ва ўсіх аддзяленнях сувязі Баранавіцкага, Івацэвіцкага, Бярозаўскага і Пружанскага раёнаў, а таксама ў паштальёнаў.

КОШТ ПАДПІСКІ:

індывідуальнай (індэкс 63834)
на адзін месяц — 190 руб., на квартал — 570 руб.;
ведамаснай (індэкс 64145)
на адзін месяц — 800 руб., на квартал — 2.400 руб.

Мы не збіраемся засмучаць вас, бо хочам быць разам з вамі. Парадуйце ж і вы нас сваёй падтрымкай.

ЧАС РЭСПУБЛІКІ

Бывай, Радзіма!

Колькасць жыхароў Брэсцкай вобласці, якія выехалі за мяжу на пастаяннае месца жыхарства, павялічылася летась у паўтара разы. Эканамічная нестабільнасць па-ранейшаму з'яўляецца асноўнай прычынай, якая прымушае беларускіх грамадзян пакідаць радзіму.

Найбольш вабяць эмігрантаў з Брэсцкай вобласці ЗША, многія выязджаюць у Ізраіль і Расію. Сярод тых, хто выязджае, нямала бізнесменаў і членаў розных рэлігійных сектаў.

Разам з тым, для каго-кольвек і Брэсцкая вобласць выглядае зусім някепскім месцам. Летась на пастаяннае месца жыхарства сюды прыехалі 3,5 тысячы чалавек. Гэта, як правіла, прадстаўнікі блізкага замежжа, перасяленцы з пацярпелых ад аварыі на ЧАЭС рэгіёнаў, бежанцы з "гарачых кропак" былога СССР. Выхадцаў з далёкага замежжа сярод іх няма.

У выбарах удзельнічаць не будуць

"Цяперашняя ўлада, якая няздольная працягваць сваё існаванне на законных падставах, рыхтуецца арганізаваць выбарчы фарс па зададзеным сцэнарыі і з загадзя вядомымі вынікамі, браць удзел у якім палітычныя партыі лічаць бессэнсоўным".

Такое сцвярджэнне ўтрымліваецца ў заяве Кансультацыйнага савета апазіцыйных палітычных партый, прынятай 22 лютага на пасяджэнні гэтай арганізацыі ў Мінску.

У заяве адзначаецца, што Выбарчы кодэкс, падпісаны А. Лукашэнкам, не адпавядае дэмакратычным прынцыпам і прыняты ў аднабаковым парадку, па-за межамі перамоўнага працэсу, нелегітымнай Палатай прадстаўнікоў, у якой прадстаўлена толькі адна трэць выбаршчыкаў Беларусі. Кансультацыйны савет звяртае ўвагу на тое, што па сутнасці падпісанне Выбарчага кодэкса азначае грубае парушэнне публічна ўзятых на сябе Аляксандрам Лукашэнкам міжнародных абавязацельстваў аб правядзенні свабодных і справядлівых парламенцкіх выбараў.

Разам з тым Кансультацыйны савет апазіцыйных палітычных партый заяўляе аб сваёй гатоўнасці да перамоў з уладамі "у фармаце, узгодненым у 1999 годзе пры пасрэдніцтве міжнародных арганізацый".

Адкрыты дыялог пачнецца з 1 сакавіка

Аб сваёй гатоўнасці ўдзельнічаць у дыялогу з усімі канструктыўнымі палітычнымі сіламі беларускага грамадства "ў любым фармаце" заявіў Аляксандр Лукашэнка 22 лютага на нарадзе ў сваёй адміністрацыі.

Нарада была прысвечана пытанням падрыхтоўкі да парламенцкіх выбараў. Удзел у ёй узялі супрацоўнікі апарату прэзідэнцкай адміністрацыі.

А.Лукашэнка падкрэсліў неабходнасць шырокай грамадска-палітычнай дыскусіі, "каб ніхто не мог сказаць, што ўлада чагосьці баіцца". Паводле ягоных слоў, не існуе пытанняў, якія не падлягалі б абмеркаванню, і ён гатовы да дыялогу з усімі палітычнымі апанентамі адносна змянення розных прававых актаў, а таксама на тэму рэформы структуры ўлады.

Падчас нарады А.Лукашэнка даручыў кіраўніцтву сваёй адміністрацыі арганізаваць з 1 сакавіка ў СМІ адкрыты дыялог прадстаўнікоў розных палітычных сілаў. Шырокая грамадска-палітычная дыскусія, па ягоных словах, павінна садзейнічаць стварэнню аптымальных умоў для свабоднага волевыяўлення грамадзян у часе маючых адбыцца парламенцкіх выбараў.

Удзельнікі нарады пацвердзілі сваю гатоўнасць супрацоўнічаць у гэтых мэтах з кансультатыўна-назіральнай групай АБСЕ ў Мінску.

Што ж скажа суд?

На працэсе па крымінальнай справе ў адносінах Андрэя Клімава і супрацоўнікаў ягонага будаўнічага прадпрыемства працягваецца выступленні абаронцаў.

У сваёй прамове грамадскі абаронца, намеснік старшыні Беларускага Хельсінкскага камітэта Гары Паганяйла заклікаў суд апраўдаць падсудных па ўсіх прад'яўленых абвінавачаннях, таму што матэрыялы крымінальнай справы ў іх дачыненні, на яго думку, фальсіфікаваныя.

Ніводнае з пастаўленых судом у віну злачынстваў па матэрыялах справы не даказана, лічыць вядомы адвакат. Грамадскі абаронца лічыць, што гэтая крымінальная справа выклікана толькі жаданнем следчых дагадзіць уладам. Арышт А. Клімава варта разглядаць, найперш, як рэакцыю на палітычную дзейнасць дэпутата Вярхоўнага Савета Беларусі 13-га склікання.

Паводле разлікаў грамадскага абаронцы Л. Бурэнкі, прадпрыемства А. Клімава не мае даўгоў перад УКБ. Такім чынам, на думку абароны, гэтая справа не з'яўляецца крымінальнай і павінна была разглядацца ў межах грамадзянска-прававых адносін у гаспадарчым судзе.

(БелаПАН).

ВОЗЬМИТЕ НА ЗАМЕТКУ

СТРАХОВЫЕ ПРЕТЕНЗИИ ПЕРИОДА ХОЛОКОСТА БУДУТ РАССМОТРЕНЫ

Международная комиссия по страховым претензиям, относящимся к периоду Холокоста (ICHEIC), начала рассмотрение претензий, связанных с невыполненными страховыми обязательствами по отношению к жертвам Холокоста, их наследникам и лицам, которым предназначалась выплата страховых пособий по полисам страхования жизни, образования и приданого, выданным в период 1920—1946 гг.

В Международную комиссию вошли такие страховые компании, как Allianz,AG,AXA,Generali, Winterthur Leben, Zurich Financial Services, а также их дочерние компании. Претензии по полисам, выданным другими компаниями, будут им передаваться на рассмотрение с просьбой об удовлетворении. Отдельный Гуманитарный фонд занимается претензиями по полисам, выданным компаниями, к настоящему времени прекратившими свое существование.

Полную информацию можно получить по бесплатным "горячим" телефонным линиям, через специальные почтовые центры или через многоязычный сайт в глобальной сети Интернет.

Лицам, проживающим в Республике Беларусь, полагающим, что у них могут быть претензии по невыполненным страховым обязательствам, писать по адресу: **220103, г. Минск, а/я 27, тел. 375-017-263-45-53, Международная комиссия по страховым претензиям**, относящимся к периоду Холокоста, или посетить сайт ICHEIC в сети Интернет по адресу: **www.ICHEIC.org**

Стройматериалы, стройся на проверку!

Госстандарт всерьез обеспокоен качеством производимых строительных материалов. В связи с этим он обязывает подведомственные ему структуры проводить обязательную сертификацию.

Барановичский центр стандартизации и метрологии провел уже 24 проверки предприятий разных форм собственности, выпускающих строительные материалы и изделия для жилищного, культурно-бытового и промышленного строительства. На всех 24 предприятиях выявлены нарушения. Сумма штрафов составила почти 1,5 млрд. руб. Выдано 30 запретов на реализацию готовой нестандартной продукции.

Среди тех, кто не в ладу с технической документацией, и несколько ивацевичских предприятий. Например, ПКП "Восход", производящее дверные блоки. На момент первой проверки сертификация продукции не была произведена. Был наложен запрет на реализацию продукции и штраф. Но "Восход" быстро сориентировался и ситуацию исправил.

"Ивацевичдрев" за реализацию несертифицированной продукции уплатили 20251 тыс. руб. штрафа и только после этого взялись за работы по сертификации.

В черный список попала и ПМК ОПС, которая производит плинтус и наличник. ПМК тоже уплатило немалый штраф за реализацию несертифицированной продукции.

Два барановичских предприятия — ПМК-2 и СМП-294 отказались от сертификации. Но следовать их примеру не стоит: эти предприятия ждут большие финансовые неприятности.

Галина СТРОЦКАЯ.

КРЫМІНАЛ

Пагарэў на гарэлцы

ІВАЦЭВІЧЫ. На працягу двух апошніх гадоў прадуктовы магазін у вёсцы Гошчава абкрадалі не менш пяці разоў. Залазілі ў яго звычайна праз падсобнае памяшканне. Апошні раз (гэта было 18 лютага г. г.) узламалі ўжо ўваходныя дзверы. Злодзей паласаваўся гарэлкай, кансервамі і цукеркамі. 40 бутэлек гарэлкі "Маскоўская" зніклі з прылаўка.

Міліцыя ў сваіх пошуках выйшла на жыхара Р. з Гошчава. Ён раней судзімы, праўда, умоўна на год з выплатай 20 працэнтаў ад заробку на карысць дзяржавы. Такім жа спосабам гэты малады злодзей пачысціў вясковы магазін і раней.

У доме бацькоў злодзея ў падсобным памяшканні знайшлі мяшок, у якім знаходзілася 15 бутэлек гарэлкі і 13 бляшанак шпротаў, а таксама цукеркі. У лесе ў кустоўі злодзей прыхаваў яшчэ 13 бутэлек гарэлкі, кансервы і цукеркі. Жыхар Р. прызнаўся ва ўчыненым крадзяжы.

Злодзей узяты пад варту. Узбуджана крымінальная справа. Ідзе следства.

Канстанцін ДЗЯМЧУК.

Чужое бокам вылазіць

ПРУЖА́НЫ. Блукаючы па гарадскім рынку, 15-гадовы вучань СШ № 5 прыглядаўся да тавараў. Спадабаўся яму гадзіннік "Камандзірскі", аднак каб набыць яго, грошай не было. "За грошы і дурань купіць, а ты так вазьмі" — па-даросламу рассудзіў падлетак. Падабраўшы момант, калі прадавец адвярнуўся ад тавараў, школьнік схапіў гадзіннік і даў лататы. Міліцыя затрымала юнага злодзея і не дала магчымасці пакрасавацца з чужым гадзіннікам.

Не доўга любаваўся залатымі ўпрыгажэннямі шафёр калгаса імя Калініна, якія ён украў у жыхаркі райцэнтра Л. Аматар дарагога і прыгожага металу затрыманы.

Заведзена крымінальная справа на двух галоўных спецыялістаў эксперыментальнай базы "Светлы шлях". Прадаючы жывёлу насельніцтву, яны змаглі прысвоіць сабе 324734 рублі (у новым вылічэнні).

Васіль СТРОК.

Сэрвіс па-зладзейску

БАРАНАВІЧЫ. Цёмныя вокны і мёртвая цішыня рэстарана "Свіцязь", зачыненага на рэканструкцыю, прывабілі аднаго наведвальніка. Зламаўшы замок і пахадзіўшы ўначы па памяшканні, ён знайшоў што ўкрасці. Яго выбар спыніўся на шліфавальнай машыне "Bosh", пяці балонах мантажнай пены, трох сілікона і шасці механізмах закрывання дзвярэй.

Па падазрэнні ў крадзяжы затрыманы 25-гадовы мясцовы жыхар, які нідзе не працуе.

Аляксандр ЛАЎРАНЮК.

АЛЁ, РЭДАКЦЫЯ?

Які маршрут гарадскога аўтобуса?

— "Газета для вас"? Паведаміце, калі ласка, аб маршруце і кошце праезду адзінага ў горадзе аўтобуса, што курсіруе па райцэнтру.

Г. ГЕРМАН (г. Івацэвічы).

На пытанне адказвае Валянціна КАЛІНКА, інжынер аддзела эксплуатацыі Івацэвіцкага аўтапарка № 4:

— Маршрут руху адзінага гарадскога аўтобуса наступны: 7 гадзін раніцы — аўтастанцыя, рынак, ПМС (былы МУААС), ІПЗ, сельгастэхніка, ПМК-18, в. Бараны, ПМК-18, сельгастэхніка, в. Міхнавічы, СШ № 3, СШ № 4, школа-ліцэй (былая СШ № 2), "Спорттавары", аўтастанцыя, СШ № 1, бальніца, в. Халап'я, бальніца, СШ № 1, аўтастанцыя;

17 гадзін — аўтастанцыя, СШ № 1, бальніца, в. Халап'я, бальніца, СШ № 1, аўтастанцыя, "Спорттавары", школа-ліцэй, СШ № 4, СШ № 3, в. Міхнавічы, сельгастэхніка, ПМК-18, в. Бараны, ПМК-18, сельгастэхніка, ІПЗ, ПМС, рынак, аўтастанцыя.

На кожны з маршрутаў затрачваецца гадзіна часу, кошт праезду — 20 рублёў, ільготны — 10. Шчаслівага шляху!

РЫНКАВАЯ ПЛОШЧА

ШТО ПАЧЫМ?

Цэны на рынках нашага рэгіёна па стану на 24.02.2000 г. (у руб. за адзін кілаграм):

	Івацэвічы	Баранавічы	Бяроза	Пружаны
Свініна	1000—2000	1600—2300	1000—1500	1200—1700
Сала салёнае	1100	1300	1200	1000
Алей (1 л)	650—850	700—900	500—770	660—750
Яйкі	450—500	400—540	500	440—460
Малако (3 л)	250	280	250—270	260
Тварог	350	400	300	360
Масла сметанк.	1100	1500—1800	1200	2000
Цыбуля рэпч.	250	200—220	200	180
Капуста	80—100	70—90	120	90
Бульба	—	100	100—110	85—100
Морква	200	250	150	120
Буракі стал.	—	60—100	100	80
Яблыкі	350—450	440—540	400—420	550—700
Грушы	950	1300	850	—
Вінаград	2500	2800	2900	—
Грэцкія арэхі	800—900	850	750	730
Часнок	1000	1300	2000	1100
Лімоны	900—1100	1200	1000	1200
Апельсіны	800	820—900	790	1000
Бананы	700—800	820—900	790	1000
Мандарыны	1000	1000	990	900
Грэчка	600	700	650	660
Макар. вырабы	270—350	300—350	280—350	250—270
Рыс	430	460—560	440—480	460
Манныя крупы	—	370	390	350
Проса	250	300	250	300
Цукар	260	260—280	270	270
Мёд	2.400	2.400	2500	2300

ВАЛЮТА НА "ЧОРНЫМ" РЫНКУ (руб.)

	купля	продаж	купля	продаж	купля	продаж	купля	продаж
1 долар ЗША	860	880	875	880	860	880	860	880
1 дойчмарка	430	440	440	450	430	440	430	440
1 рубель Расіі	30	31	30	33	30	31	28	30

КУЛЬТУРА

Стыпендыі ад міністра

Загадам міністра культуры Рэспублікі Беларусь устаноўлены дзяржаўныя стыпендыі работнікам культуры і мастацтва, творчай моладзі на 2000 год. Асобам ва ўзросце да 40 гадоў стыпендыя складае чатыры мінімальныя заработныя платы, асобам ва ўзросце звыш 40 гадоў — шэсць мінімалак.

Сярод тых 50-ці чалавек, каму пашэнціла трапіць у спіс атрымальнікаў дзяржаўнай падачкі, прадстаўнікі нашага рэгіёна. Пружанскі літаратар Мікола Сымонавіч Купрэеў будзе атрымліваць штомесячна 13 млн. 200 тысяч рублёў, каб закончыць дзве кніжкі прозы і паэзіі. Мастацкі кіраўнік народнага ансамбля танца "Юнацтва" Палаца культуры Баранавіцкага вытворчага баваўнянага аб'яднання Эдуард Паўлавіч Чарняўскі заахвочаны імянной стыпендыяй на ажыццяўленне творчага праекту "Самабытныя танцы моладзі Палесся".

Справа ўрэшце рэшт не ў грошах. Вось як нам пускаюць туман у вочы. Глядзіце, маўляў, як дзяржава падчас пагалоўнага збяднення народа знаходзіць грошы, каб заахвоціць самых таленавітых.

Аляксандр ЛАЎРАНЮК.

КОНКУРСЫ

"САМАЯ ОБАЯТЕЛЬНАЯ И ПРИВЛЕКАТЕЛЬНАЯ"

"СЯБРЫ ГАРМОНІІ І ШТАНГІ"



ЛЮДМИЛА, по гороскопу — Рыбы. Мечтаю стать экономистом, хотя не прочь и поработать в органах МВД (нравиться милицейская форма). Танцевать люблю, с удовольствием играю на гитаре. Слушаю поп-музыку.



АНДРЭЙ, па гараскопу — Казярог. Вольны час праводжу ў спартыўнай зале, у бары, рэстаране. Вельмі цаню зносіны з сябрамі. Мае куміры — Мікіта Міхалкоў, Уладзімір Высоцкі. Падабаецца манекеншчыца Клаўдзія Шыфер, а таксама высокія бландзінкі з дадзенымі 90-60-90.

ВАШЕ ПИСЬМО

НЕТ ПОВЕСТИ ПЕЧАЛЬНЕЕ НА СВЕТЕ

В последний год "Газета для вас" несколько раз помещала материалы о погибших или умерших молодых людях. Сегодня еще одна такая же трагическая и, как говорится, не новая история. Ибо впору создавать в регионе клуб несчастных матерей, которым довелось прочувствовать, пережить в этой жизни, наверное, самое страшное — смерть, похороны собственного сына или дочери.

Так получается, что молодые у нас больше погибают от чьей-то халатности, расхлябанности, невнимательности, а у родителей остаётся долгая, вечная обида или тяжба с медициной, милицией, предприятиями или хозяйствами. Сегодняшний случай — не исключение. Итак, сегодня слово Валентине Алексеевне Стрельчене, учительнице Бытенской СШ.

Это случилось 22 июля. На закруглении улицы Толочки в д. Бытень между 22 и 23 часами столкнулись комбайн и мотоцикл. За рулём комбайна находился механизатор колхоза "Бытенский"С. М. Стракович, мотоциклом управлял мой сын Василий Стрельченя, который возвращался с работы — Домановского ПТК. Комбайн двигался без осветительных приборов, загораживая всю проезжую часть. Столкновение, таким образом, было предопределено.

В результате столкновения смертельное ранение получил мой сын. 90 метров комбайн протащил мотоцикл, пока из одного из дворов не выскочила женщина, не прокричала истошно: "Стой, стой! Ты же человека убил!"

Я не буду говорить про тот шок, стресс, который испытали все мы, родители и родные Васи. Но сегодня, по прошествии более семи месяцев, не перестаю удивляться тому, что этот случай для виновника смерти сына, руководства колхоза, которое должно бы ответить за своего работника, прошел как-то буднично, незаметно. Словно смерть от столкновения нашёл не их земляк, в конце концов человек, а кто-то такой, что-то такое, о чем не стоит и вспоминать.

Мой сын за год до смерти уволился из Вооруженных Сил, но какую моральную поддержку оказали мне, матери и его жене Людмиле, бывшие сослуживцы сына. Спасибо и одноклассникам Василия, и рабочим Домановского ПТК. Только вот местный колхоз остался в сторонке. Конечно, если бы работники правления или тот комбайнер пришли на похороны, то их ждал бы не самый теплый приём. Но, возможно, они посчитали, что все со временем, как говорится, замнется, забудется. Да вот только моё материнское сердце тот случай забыть не может...

В последних числах июля до меня, человека, признаюсь, малосведущего в юридических тонкостях, дошли слухи, что по факту гибели моего сына уголовное дело возбуждаться не будет. Я позвонила начальнику РОВД С. А. Письману, который выслушал меня и предложил написать заявление. Таким образом, 2 августа было возбуждено уголовное дело и передано на рассмотрение следователю Л. Квашевичу.

Следователь Л. Квашевич опросил меня и свидетелей. Интересно, что те девочки, которые были свидетелями аварии и которые мне сразу после её описывали события, скажем так, в одном ракурсе, после стали давать несколько иные показания. Почему так? Невольно думается, что за спиной комбайнера стоит руководство колхоза, которое заинтересовано в других результатах расследования, чем я. Но меня не страшит такое положение. В расследовании дела я дойду до конца. Чего бы мне это не стоило. Терять после смерти сына мне больше нечего.

Жизнь человека. Что может быть ценнее этого дара? И, казалось бы, смерть должна расследоваться оперативно. Не как мать, а просто как чело-



век, я не могу смириться с такими темпами расследования смерти сына.

Следователь Л. Квашевич сообщил мне, что для полного выяснения обстоятельств аварии необходимо провести следственный эксперимент, который, по его словам, в республике делают только три специальные группы. Поэтому, мол, надо подождать.

Но шло время. Где-то в октябре я написала заявление-просьбу на имя нового начальника РОВД И. А. Ладыги на предмет того, когда будет, в конце концов, проведен следственный эксперимент.

Я сообщила в заявлении Ивану Антоновичу, что намерена обратиться в Минск, в Администрацию Президента. Не могу судить о том, насколько это заявление подтолкнуло следственные органы к действиям, но через день — телефонный звонок от следователя Л. Квашевича. Оказывается, следственный эксперимент можно провести собственными силами. И хоть сейчас. Нужен только мотоциклист, который бы проимитировал движение мотоцикла.

Эксперимент был проведен, приглашена была та женщина, которая последней видела моего сына живым и которая, можно сказать, единственный свидетель. Определяли скорость мотоцикла, а также видимость. После чего все разъехались, пояснив нам, что следует ждать результатов.

И опять пошло время. После Нового, 2000 года я написала заявление-просьбу в МВД РБ — в комиссию по расследованию дорожно-транспортных происшествий. Получила ответ, в котором сообщается, что наше заявление направлено в Следственный комитет при МВД РБ для дальнейшего разбирательства. В тот же день приезжал ко мне следователь Л. Квашевич, который сообщил, что нет еще заключения и что дело отзывают в МВД.

Так прошли эти семь месяцев. Создалось только у меня такое впечатление, что если бы не было с нашей стороны никаких толчков, если бы мы не напоминали о себе, то так бы и "заглохло" это дело.

Я уверена, что Правила дорожного движения мой сын не нарушил. Тот, по чьей вине сошел в могилу мой любимый и единственный сын, должен ответить за содеянное по закону. Моему больному сердцу горько видеть, как малолетний внучек тянется к портрету своего папы, зовет его. Я жду суда и надеюсь, что для того, чтобы он состоялся, мне не придется ехать на прием к Президенту Республики Беларусь...

Валентина Алексеевна СТРЕЛЬЧЕНЯ, учительница.

д. Бытень, Ивацевичский р-н.

ПАВЕДАМЛЯЕ БелаПАН

В. В. Ермошин — преемник С. С. Линга

Владимир Васильевич Ермошин родился в 1942 году в городе Пронске Рязанской области России. Окончил Новочеркасский политехнический институт и Ленинградскую академию гражданской авиации. Трудовую деятельность начал токарем Новочеркасского электровозостроительного завода Ростовской области (Россия). С 1965 по 1990 годы работал на Минском заводе гражданской авиации: вначале на должности старшего инженера, затем — главного механика и, наконец, заместителя директора. В 1990 году возглавил исполком Октябрьского районного Совета народных депутатов Минска. С 1990 по 1992 годы был заместителем председателя Минского горисполкома — председателем комитета по жилищному строительству и энергетике. В 1992—1995 годах — первый заместитель председателя Мингорисполкома. С 1995 года и по 18 февраля 2000 года возглавлял Минский горисполком. Член Совета Республики Национального собрания Беларуси. Женат, имеет двоих детей.

XXX

"Сергей Линг высоко оценивает своего преемника на посту премьер-министра — Владимира Ермошина — и считает его кандидатуру одним из лучших вариантов для главы белорусского правительства", — заявил пресс-секретарь премьера Иван Знаткевич. Пресс-секретарь подчеркнул, что глава Беларуси Александр Лукашенко консультировался с Сергеем Лингом насчет кандидатур его возможных преемников во главе Совета Министров.

XXX

Известный адвокат Гарри Погоняйло предполагает, что у В. Ермошина, входящего в окружение Александра Лукашенко, есть основания "не хотеть" давать показания и отвечать на вопросы по уголовному делу Андрея Климова. И прежде всего на те, которые могут последовать от Климова и его заместителя Леонида Волковича. Ведь при строительстве элитного дома, который предназначался для дипломатов, многое носило конфиденциальный характер.

ГОЛАС НАРОДА

Які ўзрост аптымальны для жаніцьбы?

Хтосьці разумны калісьці сказаў, што жаніся любы з нас ці не жаніся, а ўсё роўна шкадаваць прыдзецца.
Між тым, як паказвае жыццё, больш шкадуе той, хто пазбег вузаў Гіменея. Таму большасць з нас (як ні выказваемся мы негатыўна пра сямейнае жыццё) усё ж мае свае сем'і. Пытанне толькі ў тым, у якім узросце мы абмяняемся заручальнымі пярсцёнкамі. А, дарэчы, які ўзрост аптымальны для жаніцьбы? Вось якія адказы мы пачулі на вуліцах г. п. Целяханы.



Алена Анатольеўна, настаўніца: На мой погляд, якасць сямейнага жыцця, трываласць шлюбу ў значнай ступені залежыць ад кахання. Так што жаніцца трэба тады, калі па-сапраўднаму закахаешся і калі чалавек адчуе, што ён стаў самастойным, матэрыяльна забяспечаным.

Алег, механізатар: Хлопцу трэба жаніцца ў 23—24 гады, дзяўчыне — у 18—19 гадоў. Што тычыцца шаснаццацігадовых дзяўчат, якія па "залёту" выходзяць замуж, то, ведаеце, кожнаму сваё. Значыць, ёй пара.

Безумоўна, каханне адыгрывае ў шлюбе важную ролю, але, лічу, трэба і грошы. Адным каханнем сям'ю не накорміш...



Марыя, санітарка: А я, дарэчы, днямі выходжу замуж. Мне — 22 гады, і я лічу, што ўзрост мой для замужжа аптымальны. А мужчына павінен быць крышачку старэйшым.

Для нармальнай сям'і ў роўнай ступені патрэбны і каханне, і матэрыяльны дастатак. Без грошай жа і вяселля не згуляеш.



Пётр Іванавіч, дырэктар школы: Дзяўчыне пажадана да 25-ці выйсці замуж, а хлопцу да 30-ці жаніцца. Справа ў тым, што хлопцы пасля трыццаці з вялікай цяжкасцю жэняцца. Мы вось з жонкай аднаго пляменніка трыццаці год ледзь-ледзь жанілі, а другога, такога ж узросту, да гэтай пары не можам ажаніць.

Што тычыцца кахання, то яно ў шлюбе павінна быць на першым месцы.

У народ хадзілі Наталля КАПЫЦІЧ, Аляксандр ГОРБАЧ, Аляксей ГАНЧУК (фота).

БЫВАЮТ ТАКИЕ ПИСЬМА

Нам не дано предугадать...

...Мы ведь в самом деле мало следим за своими словами, поступками, делами, хорошо замечая и ловя чужие слова, дела, поступки...

В институте мне очень нравился однокурсник Женя, чувство к которому я старалась успешно скрыть все пять лет учебы и держать с ним себя старалась ровно, так же, как с другими ребятами. Прошло пять юных прекрасных лет, пока наша группа не закончила педагогический и судьба не разбросала нас в разные уголки республики.

Но отношения мы по прежнему поддерживаем, хоть каждый имеет собственную семью. Я всё так же с нежностью вспоминаю о Жене, пусть он и женат, и воспитывает двух сыновей.

Недавно я встречалась со своей хорошей подругой и однокурсницей Валей. Она всегда была коммуникабельным человеком, а тут ей повезло быть вместе с Женей на курсах. Она сегодня рассказывает, что когда они заговорили об однокурсниках, вспомнили обо мне, то Женя задумчиво произнес: "Никогда не мог понять, почему она, Тоня, меня так ненавидела". Когда я это услышала из Валиных уст — остолбенела. Я его всегда любила, а он, как видите, чувствовал совсем иное. Мне теперь нет возможности раскрыть по-другому свои чувства Жене и немного обидно, что моя скрытая нежность к нему совсем по-другому была им понята и не дошла до его сердца...

Антонина Владимировна, учительница, г. Ивацевичи.

РЭАЛІІ ДНЯ

"Не хадзі да іх. Яны "нішчыя"



"Кажу яму, сямігадоваму хлопчыку, каб пачакаў майго сына ды будзеце разам дадому ісці, бо цямнее рана, дарогу пераходзіць трэба. А ён адказвае, што яговы бацька сказаў, каб ён з маім Санькам не дружыў, разам не хадзіў, бо "вы нішчыя". У мяне аж у горле перасохла".

Гэты расповяд належыць адной трыццаціпяцігадовай жанчыне.

Дзеці, кажуць, ніколі не хлусяць. І, як сцвярджае Бенджамін Спок, тва ўсім стараюцца пераймаць, імітаваць, быць падобнымі на дарослых, пераважна сваіх бацькоў.

Таму і гульні іх падобныя на тыя, у якія мы з вамі "гуляем" у штодзённым сваім дарослым жыцці: дочкі-мамы, сям'ю, магазін, вайну... Часта мы, дарослыя, скардзімся, што не разумеем сваіх дзяцей. А сябе мы разумеем?

Гэтая жанчына расказала мне яшчэ адзін выпадак. Неяк пасля доўгіх складванняў і збіранняў купілі яны мэблевы гарнітур. Аднакласніца старэйшай дачкі, вучаніца шостага класа, убачыўшы гэты гарнітур, аслупянела, зніякавела.

"А як гэта вы купілі такую мэблю? — дапытвалася яна ў маёй Аленкі. — У вас жа заўсёды няма грошай! А колькі гэта будзе ў доларах? Калі браць па курсу, што на рынку, то гэта..."

Адкуль шасцікласніца так дасканала ведае пра долары? Адкуль такая меркантыльнасць у дзіцяці? Чаму нават у такім узросце яны дзеляць сяброў і сяброўак на багатых, бедных, "нішчых"?

Толькі не трэба маляваць дзяцей самымі непрыглядымі фарбамі, казаць, што мы не ведаем, у каго яны пайшлі, што сёння ўвесь свет паракуліўся, што яны сталі моцна разумныя...

Бо мы цудоўна ведаем, у каго яны пайшлі. У нас яны пайшлі, родненькія. У нас.

Здзіўляе толькі вось тое, з якой хуткасцю наш паўправінцыяльны люд ператвараецца ў нейкі вельмі ўжо высакародны слой насельніцтва. Прычым вельмі-вельмі тоўсты. Здаецца, ледзь не ў кожнай сям'і ў нашых Івацэвічах жывуць "предания" пра дзеда-свінапаса ці бабулю-кухарку. Адкуль жа гэтая невядома дзе ўзятая важнасць?

Віктар САЎЧЫК. г. Івацэвічы.

Тяжело жить между двух миров

Просыпаясь утром, я каждый раз вспоминаю о тебе. И с трудом могу разобраться, снился ты мне сегодня или это было вчера. К сожалению, видеться наяву мы можем крайне редко, поэтому, представь, какая радость увидеть тебя во сне. Я чувствую твоё дыхание, твои нежные руки, пробую прикоснуться к твоим губам и прижаться поближе, но, увы, уже утро, и тебя рядом нет — это сон.

Но я не унываю, а спешу на работу. Не могу дождаться твоего звонка. Если бы ты только знал, как я жду твоего звонка, а когда наконец слышу долгожданное "алло", то сердце замирает от счастья. Интересно, что чувствуешь ты, когда слышишь мой голос? Женщина ведет себя странно, когда любит, и, особенно, когда чувствует, что любят её. Хотя это является не только моей, но и проблемой всех женщин — предполагать любовь там, где её нет. А как хочется, чтобы любили всем сердцем, всей душой. Я этого хочу от тебя. Не надо красивых слов и обещаний, ты просто... люби меня.

Когда я вижу тебя рядом с другой девушкой, у меня кружится голова и шумит в ушах. Поэтому я попрошу тебя: если хочешь флиртовать с кем-то, то только в моё отсутствие. Я не хочу этого видеть.

Разве я могла предположить когда-то, что между нами произойдет. Ты был другом — и никаких грешных мыслей. Видно, Бог так распорядился, весь Он составляет расписание жизни: в ад или рай. Но куда бы ни попала, хочу быть с тобой. В этой жизни быть вместе нам не суждено, и ты знаешь почему, а я не хочу об этом вспоминать. И, как ни странно, я хочу тех неприятностей, которые возникают из-за тебя, хочу всего, что связано с тобой. И боюсь потерять. Тяжело жить между двух миров.

Жанна С., Ивацевичский р-н.

P. S. Пишу в свою любимую газету, потому что о таком больше поделиться не с кем.

Дело было вечером

(ЭССЕ)

Теплым летним вечером две подруги вышли во двор, присели на скамеечке. Наслаждались летом, теплом, пели песни, старались говорить. Дворик частного дома в Барановичах был узким, повсюду росли цветы, названия которых запомнить сложно — очень уж их много. Огород от дорожки отделял не забор, а ряд гладиолусов, еще не выпустивших стрелки бутонов. Прямо перед скамейкой — клумба. Кроме цветов на ней зеленели укроп, петрушка и лук. Странная такая клумба — за ней заботливо ухаживала хозяйка дома. Она утверждала, что это очень удобно.

Летний вечер превращался в ночь. На небе проступили капельки звезд, яркая луна незаметно появилась из-за облачка. На улицах зажглись фонари. Пёсик у будки обеспокоенно залаял, услышав лай других псов.

— Барсик, котик, помолчи, — попросила собаку одна из девушек.

Оскорбленный, Барсик залаял еще громче. Подруги рассмеялись.

— А ведь завтра рано вставать, — сказала другая.

Но они сидели, не вставали. Так легко и свободно было их душам... Они почти взлетали над спящим домиком, над городом, над всей планетой, как аромат чайных роз — он царил повсюду, хотя ветра не было.

Это чудо в душе у каждой — их молодость. И наслаждались они своей молодостью и свободой. А вечер был таким тихим, таким теплым.

Наталья КОПЫТИЧ.

Дыскатэка па-нашаму

Баранавіцкія маладыя фронтаўцы хацелі ў Дзень Святога Валянціна правесці святочную дыскатэку, аднак ім гэта зрабіць забаранілі, спаслаўшыся на нашэсце грыпу. Цікава, што БПСМ дыскатэку, нягледзячы на эпідэмію, правесці дазволілі. Не берагуць улады сваю кішэнную моладзь, не берагуць...

Алесь САШЫН.

ЗНАК БЕДЫ

...Ибо не ведают, что творят

Подростковая преступность за прошедший 1999 год, в сравнении с годом 1998, осталась на прежнем уровне. Но, увы, осталась, а не уменьшилась. Самые распространенные преступления — кража, разбой, хулиганство. Причем подростки занимаются не только кражей того, что "плохо" лежит: взламывают сараи, подвалы.

Группу таких ребят, совершивших не одну кражу, привлекли к ответственности. Араика Карамяна, 1984 г. р., лишили свободы на пять лет, а его соучастникам — Татьяне Волк и Дмитрию Молошу — отсрочили исполнение приговора на два года с подпиской о невыезде.

Всего же было расследовано 33 преступления за 1999 год, которые совершили несовершеннолетние. По 16 уголовным делам вынес приговор суд Ивацевичского района и пятеро несовершеннолетних были лишены свободы.

Высоким остался и уровень пьянства — 105 подростков (59 из которых — учащиеся школ) были привлечены к административной ответственности, а за нарушение правил торговли спиртными напитками были наказаны восемь работников торговли и общепита.

Осознанно или неосознанно, но молодые люди ломают свои жизни, либо оказываются в ситуации, когда сделать правильный выбор жизненного пути не позволяет неблагополучная обстановка в семье. На учете состоит 38 таких семей. И за 1999 год были лишены родительских прав девять граждан в отношении 15 детей. А ведь кому, как не родителям, смотреть за своими детьми и воспитывать их?

Иван ЯКУБЕЦ, начальник инспекции по делам несовершеннолетних Ивацевичского РОВД.



(Працяг. Пачатак у №№ 5, 6, 7).

4. БАЦЬКА — НАДЗЕЯ І АПОРА

Вольга Васільеўна, сястра Мікалая Букшты, успамінае:

— Прыйшоў Мікалай з арміі восенню, яшчэ і агарод поўнасцю не прыбралі. Стройны, прыгожы, у салдацкай форме са значкамі на грудзях. Нашы дзяўчаты аж заглядваліся на майго брата. У мяне на душы паспакайнела — Коля вярнуўся дадому жывы і здаровы. Апора і падмога вялікая для мяне. Ён жа адзіны з блізкай радні...

Былому салдату адпачываць у вёсцы не прыйшлося. Шмат работы ў любую пару года. Дый, па праўдзе сказаць, Мікалай не прывык сядзець без працы. З дзяцінства прыходзілася дапамагаць бацькам, а потым, калі іх не стала, разам з сястрой працаваў і ў полі, і па гаспадарцы.

А між тым у мясцовым калгасе імя Жданава чакалі свайго трактарыста. За руль новага трактара сеў Букшта. Гэта быў СТЗ "Націк" на гусенічным ходу. Такія машыны выпускаў Сталінградскі трактарны завод.

Працоўны і жыццёвы шлях Мікалая Букшты працягваўся. На гэтым шляху былі радасці і засмучэнні, боль і трывога, перамогі і няўдачы — усё, што можа быць у вясковым побыце кожнага чалавека.

Вядома, што сваёй падрабязнай біяграфіі Мікалай Букшта пасля сябе не пакінуў, дый, сказаць шчыра, не пісаў яе ніколі. Ніхто іншы таксама не складаў, хіба толькі асноўныя даты яго жыцця, змешчаныя ў кнізе "Памяць" і Беларускай савецкай энцыклапедыі. Аб асноўных падзеях у жыцці Мікалая Букшты варта сказаць колькі слоў, каб паказаць, як у розных умовах і абставінах паводзіў сябе наш зямляк, як праяўляліся яго лепшыя чалавечыя якасці.

Сам Мікалай лічыў, што адной з важных падзей пасля службы ў арміі стала развітанне з халасцяцкім жыццём. Яшчэ да арміі меў дзяўчыну ў Падстарыні, сябравалі, а ажаніўся на мясцовай азярчанцы Ніне Касавец, з якой сустракаўся зусім нядоўга. Вяселля на ўсю вёску не рабілі (не надта багата жылі), аднак сваякоў назбіралася нямала. Сямейнае свята адзначылі проста, па-вясковаму, з музыкай і гарэлкай.

Пасяліліся маладыя ў Колінай хаце. Перагарадзілі дошкамі вялікі пакой, Мікалай зляпіў печку. Так пачынала сваё жыццё новая маладая пара. Дзве сям'і — Мікалая і Олі — ладзілі між сабой, ніякіх спрэчак, ніякіх канфліктаў. Праўду людзі кажуць: у цесnце, але не ў крыўдзе. Мікалай па-ранейшаму працаваў трактарыстам у калгасе, Ніна там жа бухгалтарам.

Кажуць, што сапраўдная сям'я бярэ пачатак з паяўленнем дзяцей. Прыбаўляецца нямала клопатаў. Вось дзе выпрабоўваецца характар мужа і жонкі. Гэта без перабольшвання першы сур'ёзны экзамен на сямейным шляху.

Букшта з нецярпеннем чакаў свайго наследніка. Як і ўсе маладыя мужчыны, хацеў хлопчыка. Але яго Ніна нарадзіла дзяўчынку.

— Не чакаў такога падарунка Мікалай, — кажа Коліна сястра Вольга Васільеўна. — Засмуціўся мой брат і, паверце, нават не хацеў спярша ехаць у бальніцу забіраць жонку з дачкой. "Што ж я не мужчына?" — звяртаўся з крыўдай да мяне. Але потым малады бацька супакоіўся і паехаў у бальніцу па сваю Ніну з маленькай дачкой...

Калі Тамара (так назвалі Букшты сваю дачку)



Маладыя Мікалай і Ніна (1955 год).

падрасла, пахарашэла, то Мікалай Васільевіч часта з гордасцю паўтараў:

— Сваю Тамарку зараз і на хлопца не памяняю. Сапраўдная прыгажуня...

Яшчэ да з'яўлення свайго першынца Мікалай Букшта рыхтаваўся да будаўніцтва свайго жылля. На тую хату, дзе жыла сястра з мужам і часова Мікалай з Нінай, Букшта не прэтэндаваў. Патрэбен і ёй дах над галавой, у яе таксама сям'я. Дапамагалі Мікалаю будавацца швагер Аляксей Цюцькоў, цесць Васіль Касавец. У самы разгар будоўлі (а ставілі дом на бацькавай сядзібе, месца хапала, побач з Олінай хатай) здарылася няшчасце. Гэта адбылося ў канцы кастрычніка 1956 года. Нінін бацька (ён працаваў стрэлачнікам на чыгунцы ў Івацэвічах) ехаў на веласіпедзе з працы ў Азярцо. Грузавая машына, што імчалася ў спадарожным напрамку, зачапіла яго і, вядома, моцна пакалечыла. Тры дні Васіль Іосіфавіч праляжаў у бальніцы і памёр. Вінаватых гэтай трагедыі так і не знайшлі.

Бяду сваёй жонкі Мікалай успрыняў як уласную. Дапамагаў у пахаванні, балюча перажываў страту. Але, як аказалася, усе цяжкасці чакаліся наперадзе.

Дарэчы, у жончыных бацькоў было сямёра дзяцей — шэсць дачок і сын. Самая старэйшая Ніна выйшла замуж за Букшту. Другім па ўзросту быў Валодзя — яму ішоў 19-ты год і на момант смерці бацькі служыў у арміі. Па сямейным становішчы яго адпусцілі са службы, каб дапамагаў дома. Можна лічыць, што ўжо стала дарослай і Зоя. Ёй споўнілася 16. Астатнія чацвёра дзяўчатак былі ва ўзросце ад 2-х да 11-ці гадоў. Як жа адной маці, без гаспадара, утрымліваць такую сям'ю? Пытанне зусім няпростае. Гэта добра разумеў Мікалай Букшта. Ён ведаў гэтую вялікую сям'ю змалку і пакідаць яе на волю лёсу цяпер, у такі цяжкі час, проста па-чалавечы не меў права. Словам, Букшта звязаў свой лёс з Касаўцамі моцна і назаўсёды.

А доўгачаканы наследнік (яго назвалі Васем у гонар дзеда Васіля Міхайлавіча) неўзабаве паявіўся ў сям'і Букштаў. Мікалай Васільевіч хадзіў, як кажуць, пеўнем. Запрашаў суседзяў і сяброў на чарку, быў вясёлым і гаваркім.

Хаця Мікалай Васільевіч быў пастаянна заняты на працы ў калгасе і па гаспадарцы, ён знаходзіў час, каб пабыць са сваімі дзяцьмі, цікавіўся іх вучобай, а летам у вольны час хадзіў з імі на рэчку. Не забываў і сям'ю Касаўцоў. Амаль штодзённа заходзіў да іх. Тут жа яго, як тыя мурашы, аблеплівалі дзяўчаткі. Самая малая Ларыса залазіла на калені Мікалая і, прытуліўшыся, як да бацькі, сядзела моўчкі і ад задавальнення лыпала сваімі цікаўнымі вочкамі. Кожны раз, калі заўважалі на парозе Букшту, беглі дзяўчаткі навыперадкі, каб пабыць з ім, пагаварыць. Мікалай кожную з іх прыгалубліваў, даваў цукерку, а, адыходзячы, загадваў, каб слухалі і дапамагалі маці.

Вольга Сцяпанаўна радавалася за свайго зяця, за яго шчырасць, дабрыню і, канешне, за дапамогу. Уся мужчынская работа па гаспадарцы Касаўцоў ляжала на плячах Мікалая Васільевіча. А хлеб, што зарабляў Букшта ў калгасе, быў агульным для дзвюх сямей. Вольга Сцяпанаўна, як ніхто ў Азярцы, вельмі добра ўмела пячы хлеб. Пякла адразу на ўсіх. Хлеб атрымліваўся заўсёды духмяны і смачны. Пах разносіўся далёка ад дому.

— Мікалай Васільевіч быў для нас бацькам, — гаворыць швагерка Валянціна Васільеўна Трафімовіч. — Добрым, клапатлівым і ласкавым. Калі жаніла свайго сына, то на вяселлі Мікалай Васільевіч быў яму за бацьку...

— Калі б не ён, Мікалай Васільевіч, мы б усе скіталіся па інтэрнатах, — кажа другая швагерка Людміла Васільеўна Прысмыцкая. — А так жылі ў сваёй хаце каля маці, адчувалі яе клопаты і ласку. Былі заўсёды апранутыя, абутыя і накормленыя. Людзей, падобных Мікалаю Васільевічу, на свеце вельмі мала. Яго вылучала дабрыня, сардэчнасць, чуласць, спагада.



М. В. Букшта з жонкай Нінай, дачкой Тамарай і сынам Васем (70-я гады).

